# З ДНЁМ ВЕДАЎ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!




# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 13 (205) 1 верасня 1993 года, серада*


## ВІНШУЕМ!

**Сардэчна віншуем студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў з пачаткам новага навучальнага года і Днём ведаў.**

**Жадаем усім моцнага здароўя, шчасця, творчага натхнення, плёну ў вучобе і працы.**

**РЭКТАРАТ**
**ПРАФКАМЫ**

## На шляху да нацыянальнай школы

*А. В. БАДАКОЎ, рэктар універсітэта, прафесар*

Кожны год гэтага свята многія чакаюць з душэўным хваляваннем і радасным нецярпеннем. Хоць і прыходзіць яно да нас з пачаткам восені, але шчырыя ўсмешкі, якія расквітаюць на вуснах людзей, рознакаляровыя фарбы кветак на вуліцах і плошчах, ВНУ і школах горада робяць Дзень першага верасня — Свята Ведаў — хіба што самым прывабным з усіх святочных дзён. Гэтае свята — традыцыйнае і, бадай, самае стабільнае, бо яно непадуладна ніякім палітычным павевам і эканамічным стрэсам. Якія падзеі ні разыгрываліся б навокал, вышэйшая школа павінна цвёрда і ўпэўнена трымаць курс на ажыццяўленне сваёй важнейшай задачы, у імя якой яна існуе і якая застаецца заўсёды традыцыйнай: падрыхтоўка высокакваліфікаваных, высокаадукаваных кадраў спецыялістаў для народнай гаспадаркі суверэннай Беларусі. Луі Пастэр калісьці зазначыў: «З усіх народаў першым заўсёды будзе той, які апярэдзіў іншых у галіне думкі і разумовай дзейнасці». Апярэдзіць, зразумела, той, хто здолее адпаведным чынам і на адпаведную вышыню паставіць адукацыю свайго маладога пакалення.

Час патрабуе ўносіць істотныя змены ў накірункі і змест вышэйшай адукацыі. Асноўнае тут — стварэнне такой мадэлі вышэйшай школы, якая грунтуецца на нацыянальна-культурнай аснове, абапіраецца на нацыянальныя дасягненні, традыцыі, спадчыну.

У гэтым плане ў нас зроблена нямала. Паслядоўна рэалізуецца Закон аб мовах, Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў. На іх аснове Вучонай радай прынята адпаведная універсітэцкая праграма. На ўсіх факультэтах вывучаецца айчынная гісторыя і культура, беларуская мова, літаратура. Пашырылася сфера ўжывання беларускай мовы. На ёй выдаюцца падручнікі і навучальныя дапаможнікі, вядзецца дзелавая дакументацыя, праводзяцца пасяджэнні, мерапрыемствы. З бягучага навучальнага года ўсе першыя курсы педагагічных спецыяльнасцей пяройдуць на беларускамоўнае выкладанне.

Аднак няправільным было б стварэнне вышэйшай нацыянальнай школы абмяжоўваць толькі мясцовым матэрыялам, бо гэта непазбежна прывядзе да нацыянальнай замкнутасці і нацыянальнага нігілізму. Тут важна арыентавацца на сусветныя дасягненні, на агульначалавечыя каштоўнасці, шырока развіваць навуку, цесна супрацоўнічаць з краінамі далёкага і блізкага замежжа. Універсітэт будзе надалей развіваць у гэтым плане сувязі з ВНУ Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, ЗША і іншых краін. У гэтым бачыцца істотны фактар, які дапаможа інтэграваць нашу вышэйшую школу ў сістэму перадавой сусветнай навукі і адукацыі.

Пад нацыянальную адукацыю павінна быць падведзена сучасная матэрыяльна-тэхнічная і навукова-даследчая база. Не стварыўшы яе, нельга гаварыць аб якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Складанасцей і перашкод тут нямала. Неспрыяльна складваецца эканамічная і палітычная сітуацыя ў рэспубліцы, недастатковы ўзровень дзяржбюджэтнага фінансавання. У многім нам дапамагае камерцыйная дзейнасць, якая пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца.

Універсітэт мае моцны прафесарска-выкладчыцкі корпус. Штогод у ім адбываюцца якасныя змены. Падрыхтоўку будучых спецыялістаў вядуць 460 выкладчыкаў і 40 навуковых спецыялістаў, у іх ліку — 35 прафесараў, дактароў навук, 230 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Толькі за 1993 год абаронена 3 доктарскія, 8 кандыдацкіх дысертацый.

Пашыраецца кола навуковых даследванняў, якія выконваюцца ва універсітэце, іх тэматыка зарыентавана ў большай ступені на патрэбы рэспублікі, на даследванне фундаментальных праблем у розных галінах народнай гаспадаркі і навукі.

Карэнная перабудова працэсаў навучання патрабуе змянення ў ім ролі прафесарска-выкладчыцкага саставу, псіхалогіі і мыслення студэнтаў. Яна заключаецца ў тым, каб зрабіць паварот ад выканання функцый перадачы навукова-прафесійных ведаў да функцыі арганізацыі і кіравання пазнавальнай дзейнасцю. Без укаранення новых тэхналогій навучання, такіх як інварыянтасць, праблемнае навучанне, сітуацыйныя дзелавыя гульні, сродкі вылічальнай тэхнікі, камп'ютэрызацыя і іншыя немагчымы высокі ўзровень навучальнага працэсу.

Неабходна абнаўляць змест навучальных дысцыплін, вызваляцца ад цяжару аджываючых канцэпцый і ідэалагічнай зашоранасці.

Шлях да нацыянальнай вышэйшай школы нялёгкі і цярністы. І толькі напружанай працай, творчым уздымам усяго калектыва універсітэта можна яго пераадолець.



## СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

*У наступным годзе Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы будзе адзначаць сваё 50-годдзе*

- У 1944 годзе ў Прынёманскім краі адбылася падзея вялікага значэння. Рашэннем Савецкага ўраду тут быў створаны Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут, на базе якога пятнаццаць гадоў назад адкрыты універсітэт.
- Да пачатку 1945 года ў інстытуце вучыліся 138 студэнтаў. Прафесарска-выкладчыцкі склад налічваў 10 штатных выкладчыкаў і 10 працавалі па сумяшчальніцтву.
- На пачатак 1950-51 навучальнага года ў інстытуце было ўжо 55 выкладчыкаў, пяць з якіх мелі вучоную ступень кандыдата навук.
- У 1954 годзе быў адкрыты гістарычны факультэт, а ў 1956 на базе гістарычнага і філалагічнага факультэтаў створаны гісторыка-філалагічны факультэт.
- Далей у розныя гады створаны факультэты педагогікі і методыкі пачатковага навучання, хіміка-біялагічны, музыкі і спеваў.
- У 1974-75 навучальным годзе на пяці факультэтах дзённага і завочнага аддзяленняў навучаюцца ўжо каля 4 тысяч чалавек.
- Пры інстытуце быў створаны вучэбна-кансультацыйны пункт, які абслугоўваў студэнтаў-завочнікаў 40 ВНУ краіны.
- За 30 гадоў сваёй дзейнасці інстытут падрыхтаваў для школы 10 тысяч настаўнікаў. На 18 аддзяленнях факультэта грамадскіх прафесій другую грамадскую спецыяльнасць пад кіраўніцтвам 39 выкладчыкаў набываюць 110 студэнтаў. Інстытуцкі тэатр юнага гледача стаў лаўрэатам Усесаюзнага агляду тэатральных калектываў мастацкай самадзейнасці.
- У ВНУ створаны добрыя ўмовы для фізічнага развіцця і росту майстэрства па многіх відах спорту. У педінстытуце вучыліся ў розны час чэмпіёны Алімпійскіх гульняў у Токіо гімнастка Алена Валчэцкая, гімнастка, чэмпіёнка СССР Тамара Аляксеева, уладальніца трох залатых і адной сярэбранай медалёў XX Алімпійскіх гульняў у Мюнхене гімнастка Вольга Корбут, лёгкаатлет, прызёр Алімпійскіх гульняў у Маскве Пётр Пачанчук і іншыя спартсмены міжнароднага класа.
- У 1978 годзе на базе Гродзенскага педагагічнага інстытута створаны Гродзенскі дзяржаўны універсітэт.
- У 1979 годзе адкрыты навукова-даследчы сектар, вылічальны цэнтр.
- Вялікая роля інстытута і універсітэта ў развіцці народнай адукацыі вобласці. На Гродзеншчыне няма ніводнай школы, у якой не працавалі б выпускнікі ВНУ. Яе закончылі пісьменнікі Пятрусь Макаль, Данута Бічэль-Загнетава, Аляксей Карпюк, Фёдар Янкоўскі і іншыя работнікі творчых прафесій.
- Выпускнікі Гродзенскага педінстытута і універсітэта праявілі сябе высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Каля 250 выпускнікоў узнагароджаны высокімі ўзнагародамі, больш як 50 з іх прысвоена званне Заслужанага настаўніка, звыш як 300 адзначаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі БССР».
- Каля 200 выпускнікоў сталі вучонымі і працуюць у розных навуковых установах АН Беларусі і ВНУ рэспублікі.

## ТЭЛЕТАЙП

### З дзелавым візітам

Нядаўна наш універсітэт наведаў дырэктар камерцыйнай школы з г. Мец (Францыя) пан Джон-П'ер Маўрот. Мэтай візіту было ўстанаўленне дзелавых узаемаадносін з універсітэтам па праграме Міжнароднага эканамічнага супольніцтва «Тэмпус-II». Гэта праграма распаўсюджваецца ў краінах былога СССР і накіравана на паляпшэнне якасці выкладання ў сістэме вышэйшай адукацыі. Яна дапаможа рэканструяваць універсітэты ўсходнееўрапейскіх краін.

Госць з Францыі меў гутарку з прарэктарам В. П. Таранцеем, іншымі супрацоўнікамі універсітэта.

### Новыя курсы

На кафедры педагогікі ў бягучым навучальным годзе ўпершыню ўводзяцца два новыя курсы —«Сучасныя педагагічныя тэхналогіі» і «Сацыяльная педагогіка». Апрабацыя курса па сацыяльнай педагогіцы будзе ажыццяўляцца на базе біялагічнага факультэта. У рамках курса «Сучасныя педагагічныя тэхналогіі» студэнты будуць вывучаць педагагічныя аспекты канфліктalогіі, метады, прыёмы і сродкі актывізацыі навучання школьнікаў, пытанні дыялектыкі выхавання і самавыхавання навучэнцаў, педагагічнай дыягностыкі і іншыя.

### Сталі паўнапраўнымі студэнтамі

Больш як 400 абітурыентаў, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу, залічаны загадам рэктара ў склад студэнтаў. У асноўным гэта студэнты факультэтаў правазнаўства, пачатковага навучання і міжнародных эканамічных адносін. А займацца яны будуць на дагаварной падставе, заплаціўшы за курс навучання грошы.

Завяршыўся таксама набор студэнтаў з ліку тых, хто мае ўжо вышэйшую адукацыю і хоча набыць яшчэ адну. Так, на аддзяленне міжнародных эканамічных адносін залічаны 34 чалавекі, на правазнаўства — 67, ёсць жадаючыя стаць настаўнікамі.

Новая прыкмета часу — сёлета ўпершыню ў нас утварыўся конкурс сярод абітурыентаў, якія пажадалі вучыцца на платнай падставе.

І яшчэ адна характэрная дэталь. На аддзяленні міжнародных эканамічных адносін упершыню пачалі рыхтаваць кадры па такіх прэстыжных спецыяльнасцях, як маркетынг, менеджмент, фінансы і міжнароднае права.

